Сьвятлана Дзядзінкіна-Гук



...кожны чалавек займаецца сваім PR,
каб быць цікавым для іншых...

# Крыніца, з якой выцякае слова... *Польскі дзёньнік.*

**PR – utrzymanie dialogu i porozumienia.**

Варшава – горад касьцёлаў і крыжоў, манахаў і вернікаў. 300 касьцёлаў і капліцаў, аб'яднаных у дзьве епархіі, у нядзельную раніцу напаўняюцца ўмілаваным панствам (благачынным людам), людзі прыносяць Хрысту свае сумневы і спадзяваньні, боль і радасьць, скруху і непакой. Магчыма, ці ня з гэтай прычыны варшавяне натуральна ветлівыя і шчырыя, простыя і дабразычлівыя ў зносінах? Лічыцца, што 90% (іншыя прыводзяць лічбу 70%) насельніцтва Польшчы – веруючыя.

У гэтым горадзе можна заблукаць як у лесе. Прыродныя ландшафты тут пануюць як у цэнтры, так і на ўскраінах. Вісла, вольная ад каменных плітаў, дыхае як сталая жанчына ў алiўным садзе, і каб ня гэтыя ажурныя маставыя збудаваньні, цяжка было б уявіць абрысы гарадской Віслы. Чым далей ад Старога гораду і Новага Мяста, тым болей гарадскія кварталы забудоўваюцца пасярод зялёных баркоў і хвойнікаў. Вядома,

што паркі і скверы займаюць ці не палову плошчы гораду. Варшава – самая зялёная сталіца ў Еўропе?

На адной такой лясной ускраіне ў раёне Фаленіца месьціцца Еўрапейскі цэнтр камунікацыі і культуры, нядаўна заснаваны каталіцкім ордэнам езуітаў. Гэта – навуковы інстытут Папскага Багаслоўя, на базе якога праходзяць прафесійныя курсы і трэнінгі ў розных галінах культуры і навукі для журналістаў, выкладчыкаў, тых, хто ўдзельнічае ў грамадскім і гаспадарчым жыцьці, для душпастырскіх і няўрадавых арганізацыяў. Здаецца, тут пануе дух вольнадумства і адкрытасьці. Гэта адчуваецца ва ўсім: і падчас заняткаў, у спрэчках з "панам прафесарам", і ў неабмежаваным выкарыстаньні Сусьветнай Павуціны, і нават у штодзённых малітвах.

## Куртмала.

Гэта імя нашага перакладчыка. Невысокі, хударлявы, чарнавокі, ён падобны на школьніка-выдатніка. Назваў сваё імя, але мы нават не запомнілі, настолькі дзіўна яно прагучала. Пасьля перапынку мая знаёмая тэолаг Жанет мне шапнула: ён з крымскіх татараў...

Куртмала – закончыў асьпірантуру пры Варшаўскім універсітэце па сьпецыяльнасьці сацыялогія, але яшчэ не пасьпеў абараніць дысертацыю, гэтым і тлумачыць сваю "затрымку" ў польскай сталіцы. Мне падабаецца сачыць за тым, як час ад часу ён удумліва падбірае тое ці іншае слова, каб пераклад атрымаўся найбольш поўны і дакладны. Ён выдатна валодае сучаснай палітычнай тэрміналогіяй, але імкнецца даносіць яе да слухача незвычайна проста, без усялякіх сэнсавых нагрузак. Пераклад – гэта яго спосаб падрабіць крыху на жыцьцё, заплаціць за кватэру, якую ён здымае за 200 даляраў.

У апошні вечар, калі абарона нашых індывідуальных PR-праектаў зацягнулася аж да поўначы, і Куртмала вымушаны быў застацца ў Фаленіцы (транспарт у Варшаве ходзіць і ноччу, але езьдзіць на ім небясьпечна: апошнім разам у Куртмалы хуліганы выкралі мабільнік), ён даў мне ўрок сапраўднага пі-ару, без купюраў. Я, хварэючы на прафесійную дапытлівасьць, задавала і задавала пытаньні хлопцу, а ён бяз ценю сарамлівасьці ці закрытасьці распавядаў быццам даўняму сябру пра свае самыя патаемныя думкі... Такое бывае з двума малазнаёмымі людзьмі, якія разумеюць, што больш яны ніколі ня ўбачацца.

Спачатку была песьня па-французску пад акампанемент гітары. Прыгожая і тонкая. Куртмала ўсьміхнуўся, што фрацузскую ён ня ведае, а сьпявае толькі адну гэтую песьню.

– А на сваёй роднай мове?

– О, колькі заўгодна!

Ён засьпяваў, а ў голасе столькі суму. Мова крымскіх татараў зьнікае, як і сам гэты маленькі народ, пазбаўлены ў недалёкім мінулым сваёй радзімы. У сталінскія часы яго дзеда выслалі ва Узьбекістан. У 1989 годзе сям'я, як і многія іншыя крымскія татары ў той час вырашыла вяртацца на родныя камяні. Адбывалася геаграфічная рэабілітацыя. Людзі прадавалі дамы і краналіся з месцаў, якія абжылі за дзесяцігоддзі. Вярталіся на радзіму, якая ня вельмі ласкава іх сустракала.

У Бахчысараі сям'я Куртмалы яшчэ і дагэтуль не дабудавала свой дом, сапраўды, столькі каменьня, што і сады квітнець ня хочуць. Але руплівыя і ўпартыя гаспадары садзяць абрыкосы і грушы насуперак лёсу і прыродзе, ствараюць свае спрыяльныя, штучныя ўмовы.

Куртмала гаворыць пра беднасьць. Ня дзеля таго, каб выклікаць спачуваньне ці жаль, не, ён горды татарын, ён адчувае, калі яго слухаюць, а, значыць, зразумеюць.

Перасяленцам, ці як зараз іх клічуць мігрантам, (а іх было тысячы!) працаўладкавацца ў Крыме амаль нерэальна. Яго маці за капейкі працавала на пякарні. Ён са стыпендыі адкладаў грошы, каб купіць будматэрыялы для дома. Пасьля заканчэньня школы паехаў вучыцца ў Польшчу ня ў пошуках лепшага жыцьця, ня дзеля таго, каб потым найлепш уладкавацца ў заможнай краіне еўрапейскага захаду, а каб вярнуцца назад, у Крым, і быць карысным радзіме.

– Што цябе цягне ў Крым? Прыгожыя краявіды? Каханая?

– Сям'я. Я малодшы сын сваіх бацькоў. Малодшы зьяўляецца гаспадаром у бацькоўскай хаце.

Гэты адукаваны хлопец лічыць, што яго будучая нявеста абавязкова будзе татаркаю, якая народзіць яму некалькіх дзяцей, і жыць яны будуць побач з бацькамі. Ён так выхаваны. Мне хочацца верыць, што ўсё будзе менавіта так. І ён знойдзе ў сябе на радзіме работу па сваёй сьпецыяльнасьці, адпаведна атрыманай адукацыі.

## Найважнейшы закон.

Жыць у згодзе. Людзям розных веравызнаньняў, нацыянальнасьцяў, узросту, грамадзянства, інтарэсаў і інш. Любоў ёсьць найважнейшым законам Валадарства, гэта значыць забыць пра сябе, а быць – для бліжняга. Евангельскі закон ня страчвае сваёй надзённасьці, асабліва ў Год Эўхарыстыі – 2005-ты, аб'яўлены Папам Янам Паўлам II.

Сьвяты Айцец узвысіў палякаў у сьвеце. Але ён сам не дазваляў сабе аддаліцца ад простага люду, мільёнаў вернікаў з Еўропы, Афрыкі, Амерыкі.

Праглядаю каталог новых выданьняў аднаго з польскіх выдавецтваў. Назва "Як паляк з палякам". Гэтая кніжка пра што? Дыялог Папы Яна Паўла II з землякамі. Проста і сьціпла. Без каментараў, як кажуць.

Яму зрабілі аперацыю. І гэта навіна №1 для ўсіх польскіх СМІ. Журналісты пільна сочаць за любой дадатковай інфармацыяй на гэтую тэму. "Газета Выборча" адшукала нават грамадзянку, якой нядаўна таксама зрабілі адпаведную аперацыю на гартані, і яна сьведчыла пра свой стан здароўя тады і цяпер... Звычайная чалавечая дапытлівасьць і чульлівасьць у паралелях.

За адным сталом у ЕССС штодня сядзяць грэка-каталікі, праваслаўны сьвятар, баптыст, рыма-каталікі, мусульманін. Яны дазваляюць сабе пажартаваць сьціпла, незласьліва, амаль з любоўю, адзін да аднога. Але ўсім вельмі цікава быць разам, вучыцца талерантнасьці, якая таксама завецца "паблік рылейшэнз".

Мусульманін Куртмала Абдулганіеў не ўжывае сьвініну, але ён з павагай ставіцца да тых, хто па-суседску за адным сталом есьць салянку з вяндлінай, ні носам, ні вухам не павядзе. Прэс-сакратар Мітрапаліта Менскага айцец Аляксандр Шымбалеў гучна і з гонарам запявае "Многія лета" ў зале манахаў – езуітаў і ўсе прысутныя падхопліваюць, каб падтрымаць адзінага тут прадстаўніка праваслаўнай царквы. Ён сапраўды вылучаецца сярод іншых: заўсёды ў чорным строі, беласьнежнай кашулі і гальштуку. Такіх зараз не сустрэнеш: інтэлігент старой закваскі. Дарэчы, калекцыянуе этнаграфічныя сьпевы народаў сьвету. І выкладае астраномію ва ўнівэрсітэце імя М. Танка.

## Куратар доктар Кшыштаф.

Ён зьбянтэжыў нас адразу тым, што сказаў: "Езус Хрыстус быў першым "піаршчыкам". Гучыць нязвыкла, а можа гэта такі "ход канём"? Я паверыла і не паверыла. Наколькі гэта не абразьліва, не блюзьнерства, разважаю дагэтуль...

Мы – людзі, якія хочуць перадаць інфармацыю і дасягнуць мэты. Мы – атрымальнікі той самай інфармацыі. Мы – інструменты, праз якія гэтая самая інфармацыя засяроджваецца. Вось як.

Усё б нічога, калі б 80 гадоў таму амерыканцы не дадалі паблік рылейшэнз эканамічны зьмест. З таго часу PR і выгода цесна пераплеценыя. Толькі ня трэба блытаць PR з рэкламай. Знаўцы і тут ўсё прадугледзелі: у рэкламе мы самі гаворым пра сябе, а PR – гэта тое, што пра нас гавораць іншыя, і бяз грошай!

Але ж пра якую выгоду думаў Езус? Вядома ж, ён вучыў і вучыць нас не шукаць выгодаў для сябе, а дбаць пра бліжэйшага.

Як і ўсялякі прагрэсіўны чалавек доктар Кшыштаф Бакаларскі выступае супраць забаронаў, лічыць іх прыкметай бюракратычнага грамадства. Але ён бязьлітасьціва крытыкуе нашыя думкі, выказаныя ў самастойных вучэбных ПіаР-праектах. У гэтай бязьлітаснасьці я праглядаю ягоную адказнасьць за сваю школу. Інакш навошта ён сядзеў бы разам з намі цэлымі днямі на занятках, якія праводзілі іншыя выкладчыкі і эксьперты? Спачатку гэта нас зьдзіўляла, а потым усе прывыклі да яго "кураторства". Неяк я спытала, чаму ён слухае лекцыі сваіх калегаў? Адказаў, што яму цікава. Кагнітыўны элемент – першасны ў адносінах псіхалогіі паблік рылейшэнз.

Еўрапейскае замежжа пасьпяхова засвоіла новыя камунікацыйныя прынцыпы, так што нам, беларусам, яшчэ цягнуцца і цягнуцца за імі. У нас – ідэалогія, у іх – філасофія; у нас – перакананьне, забойнае, у лоб, у іх – спосаб мысьленьня, лёгкі, варыятыўны.

## Чорны колер маніпуляцыі.

Менавіта з-за здольнасьці PR мяняць свой колер, суб'ектыўнае стаўленьне да яго няпэўнае, зьменлівае, недаверлівае, калі ня цалкам негатыўнае. Белы, шэры, чорны PR. Каляровыя сімвалы адначасова зьяўляюцца ацэначнымі паняцьцямі, як сэнсы станоўчы, нейтральны, адмоўны. Як жа аддзяліць адзін ад другога? Увесь пачатак – у крыніцы, з якой выцякае слова. Крыніца чыстая, ясная, ці невядомая, ці наогул каламутная?

Лічыцца, чорную прапаганду нарадзіла вайна. Яна забівала ня толькі зброяй, але й словам. З таго часу выпрацаваліся стандарты, ня самыя слушныя для чалавецтва. Напрыклад, закранаючы звычайныя чалавечыя патрэбы вы схіляеце чалавека да свайго пункту гледжаньня і не пакідаеце яму права выбару і права на адступленьне. Ці падаць узор такім чынам, што ўсе пачнуць упадабляцца яму, а вы з гэтага атрымаеце дывідэнты... Чалавек – статкавая жывёліна.

Аналітыкі нават выявілі сьмяротныя грахі PR і назвалі іх метафарамі: воз перад канём; філасофія крану: калі табе трэба – адкрываеш, калі не – закрываеш.

У мінулыя стагоддзі, калі не існавала яшчэ такога колкага слоўца, як PR, таксама былі розныя такія "хітрыкі" накшталт таго. У 1897 годзе прыехаў у Варшаву расейскі цар Мікалай II. Сустрэлі яго як трэба, задаволены імператар згадзіўся на прапанову паставіць на Кракаўскім прадмесьці помнік Міцкевічу і адкрыць яго ў стагоддзе з дня нараджэньня паэта. Аднак паставіў умову: вышыня помніка павінна быць на галаву ніжэй статуі генерала Паскевіча, таго што ў 1831 годзе падавіў польскае паўстаньне і атрымаў тытул сьвятлейшага князя Варшаўскага. Палякі згадзіліся з расейскім праектам. Але да пастаменту дабудавалі некалькі прыступак...

Пры адкрыцьці помніка ўсе ўбачылі, што Міцкевіч не ніжэй, а вышэй генерала якраз на галаву...

Сёньня чорны PR ператварыўся ў інфармацыйнае бедства нашых краінаў. Любая сфера можа стаць аб'ектам чорных піяршчыкаў, асабліва што датычыць бізнэсу і палітыкі. Толькі ў Польшчы каля 500 агенстваў PR, вакол якіх канцэнтруюцца групы журналістаў і былых работнікаў сьпецслужбаў. Яны ж безыдэйныя – працуюць на тых, хто плоціць... Распаўсюджаны тып паслугаў – крызісная дапамога. Раз-

мовы з кліентам маюць усяго два вектары: грошы і вашы патрабаваньні. У выніку палітыкаў можна абвінаваціць у шпіёнстве, карупцыі, амаральных сэксуальных сувязях, бізнэсоўцаў – у карупцыі, махлярстве, ашуканстве, банкруцтве.

Усё гэта падобна на мышыную валтузьню, марнаслоўе. PR сам па сабе ніколі ня зьменіць палітыкі.

## Маніторынг.

Дарэчы, таксама моднае цяпер слоўца. Назіраць можна за ўсім, абы было каму. У інфармацыйным цэнтры польскага ўраду ёсьць аддзел маніторынгу СМІ. У ім адсочваюць інфармацыйныя плыні ўсіх каналаў: тэлебачаньня, радыё, друку. Можна было падумаць – вось яшчэ адно вынаходніцтва схаванага віду цэнзуры. Дарэчы, сапраўды, шматлікія палітолагі прызнаюць, што калі ўлады назіраюць за тым, што піша друк, значыць у любы момант яны могуць выклікаць галоўнага рэдактара ў кабінет на размову з адпаведнымі наступствамі. Але гэтае магчыма, калі газета залежыць ад уладаў. Каб гэтага пазьбегнуць, ва ўсім сьвеце існуе інстытут незалежнага друку.

У канцылярыі прэсы Рады міністраў Польшчы маё пытаньне пра падобнае цэнзураваньне “зьнялі” адразу (яно іх нават напалохала), бо падобныя паводзіны ў адносінах улады і СМІ тут проста немагчымыя, бо немагчымыя, і ўсё тут.

Тая ўлада, якая сябе паважае, ня можа ня ведаць, пра што вядуць дыялог сёньняшнія СМІ. Такім чынам яна трымае руку на пульсе свайго грамадства. Адной з галоўных задачаў інфармацыйнага цэнтру ўраду зьяўляецца пастаянны кантакт з журналістамі розных выданьняў, для гэтага ў чыноўнікаў ёсьць нават сьпіс іх мабільных тэлефонаў. Абавязковай справай тут лічаць і рассылку прэс-рэлізаў на адрасы некалькіх сотняў (!) медыяў. Прэс-сакратары лічаць: журналісты маюць права ляніцца, і яны гэта права паважаюць, калі хочуць ня страціць кантактаў...

Цікава, Рада міністраў, куды мы трапілі дзеля знаёмства з прэс-службай, месьціцца ў былым палацы Радзівілаў. Перад ім – помнік Юзэфу Панятоўскаму. Калісьці рускі цар падараваў гэтую скульптуру фельдмаршалу Паскевічу. Панятоўскі на кані ўпрыгожваў палацавы парк у Гомелі амаль стагоддзе. Потым яго перавезьлі ў Варшаву. Але бамбёжкі 1944-га ён не перажыў.

У 1952 годзе помнік быў адноўлены ў Капенгагене і падораны варшавянам.

## Дай сябе зразумець.

Цяпер, калі сьвет заклапочаны пагрозай, што навісла над агульначалавечымі каштоўнасьцямі, кожны індывідуум паасобку дбае пра ўласны посьпех. Ад посьпеху залежыць вашая рэпутацыя і проста матэрыяльны дабрабыт, часам – элементарнае выжываньне. У выніку кожны займаецца сваім PR, каб прасоўвацца на рынку. Уся прастора вакол нас – гэта і ёсьць рынак. А мы – яго макраэлементы з пэўнай ступеньню прамоцыі. Вядома, ва ўсім вінаватыя амерыканцы, якія стварылі гэты чортаў рынак, а нам так хочацца проста “каўбасіцца” і ня дбаць пра ўласную рэпутацыю і посьпех.

Кожны чалавек займаецца сваім PR, каб быць цікавым для іншых. Інакш глабалізацыя прыцісьне і расьцісьне ўсіх паасобку. Дзелавыя людзі не саромеюцца даваць парады пачынаючым: вызначы, *хто для цябе важны* сярод навакольных і чаму. Такая сегментацыя навакольля дапаможа табе дабіцца выніку праз камунікацыю. Але якое ж месца ў такой пазіцыі займае хрысьціянская мараль: *усе* людзі, што *вакол цябе аднолькава* для цябе *важныя* і роўныя?

Як часта мы скардзімся самі сабе, што іншыя нас не разумеюць. Мы пакутуем з гэтае прычыны. Няма разуменьня – няма дыялогу. Але ўсё было б вырашальна, калі б пра нас ведалі больш, калі б нашая дзейнасьць была навідавоку, адкрытай і “праз-

рыстай", як модна мовіць. Сёньняшні сьвет вылучае прынцыпы эфектыўнасьці. Эфектыўнасьць абуджае сьпячых і кволых, скептыкаў і песімістаў. Што ні гаварыце, больш пасьпяховы той, хто не баіцца людзей і любіць сябе, хто ўмее канцэнтравацца, валодае высокай моўнай культурай.

**Разьвітаньне з Папам Рымскім.**

Я вярнулася з Варшавы, у якой яшчэ моцна адчуваецца бруд і шэрасьць постсавецкай дзяржавы. Няўтульна, бедна, непрыемна на вакзале "Варшава Усходняя", у цягніках, страшна на вакзале ў Тэрэспалі. Адкрылася зусім іншая краіна галечы матэрыяльнай і духоўнай. Наступствы камуністычнага гвалту выпіраюць тут натуральна, бо няма патрэбы іх штучна хаваць, як гэта рабілася ў савецкія гады. Адзінай альтэрнатывай афіцыйнай прапагандзе тады ў Польшчы заставаўся касьцёл. Праз дыпламатычную пошту Ватыкану тады можна было перадаць тое, што не дазваляла цэнзура таталітарнай сістэмы. Уявіць цяжка, як у такіх умовах вырас кардынал Вайтыла, будучы Папа Рымскі, пасьля прыняцьця пантыфікату – Ян Павел II?

У яго была душа паэта, а розум дыпламата. Ён рана страціў бацькоў: маці – у дзевяцігадовым узросьце, бацьку – калі быў студэнтам. Жыцьцёвыя выпрабаваньні прыўнесьлі свой каларыт у фарміраваньне ягонай пазіцыі. Пасьля вайны ён стаў сьвятаром. І ў гэтым была найвялікшая таямніца і вялікі сэнс. Для палякаў ён нёс крыж барацьбы з камуністычнай ідэалогіяй. І гэтая барацьба закончылася перамогай. Перамогай Волі і Гуманізму. Менавіта ў часы яго пантыфікату службы ў касьцёлах пачалі весьці на роднай мове, а не на латыні, як раней.

Зразумець любоў да свайго Пастара, калі ты, лічы, ніколі з ім не сустракаўся, дапамагаюць сучасныя камунікацыйныя тэхналогіі. Прамая трансьляцыя з Плошчы сьвятога Пятра ў Ватыкане падчас разьвітаньня з пантыфікам адначасова яднала мільярды людзей з усіх канцоў сьвету. "Бог ёсьць Любоў", – гаворыць каталік каталіку і разумеюць гэтыя словы як існаваньне духоўнай повязі паміж Сьвятым Айцом і ягонай паствай.

Польскі мастак з Нью-Ёрку Пётр Укланскі стварыў незвычайны партрэт Папы Яна Паўла II. Некалькі гадоў мастак вандраваў па Бразіліі і зрабіў некалькі тысячаў фотаздымкаў салдатаў. Пасьля Укланскі склеіў з іх вялікі партрэт (9,5 на 8 метраў) свайго славутага суайчынньніка – Папы Яна Паўла II.

Гэтая работа была ўпершыню прадстаўленая на 26-ым біенале сучаснага мастацтва ў Сан-Паулу ў сакавіку мінулага году. Нядаўна авангардны партрэт пантыфіка ўдзельнічаў у варшаўскай дабрачыннай выставе, сродкі ад якой пойдуць на стварэньне Музею сучаснага мастацтва ў польскай сталіцы.

Партрэт Папы, сабраны з твараў салдатаў... Больш моцны Сімвал супраць гвалту, жорсткасьці, вайны і тэрору цяжка і прыдумаць.